УДК 821.161.3

# ВЕРСЭТ У ПАЭЗІІ АЛЕСЯ РАЗАНАВА

***А.А. Дзенісевіч*** (МДУ імя А.А. Куляшова)
Навук. кір. ***Т.І. Борбат***,
канд. філал. наук, дацэнт

Напрыканцы апошніх дзесяцігоддзяў XX ст. значнае месца ў творчасці А. Разанава займае версэт. У 1988 г. выйшаў асобны зборнік версэтаў паэта «Вастрые стралы». Цыклы версэтаў змяшчаюцца таксама ў зборніках «Паляванне ў райскай даліне» (1995), «Рэчаіснасць» (1998). А. Разанаў так аніевае сваю вынайдзеную жанравую форму ў аўтарскай анатацыі да першай публікацыі версэтаў у 1983 г.: «Мне ўяўляецца, што такая форма тоіць у сабе багатыя магчымасці: у ей могуць арганічна спалучацца і лірычнае ўзрушэнне, і фабула, уласцівая апавяданню, і філасофская сентэнцыя, і эксперыментальны свет антыўтопіі і навуковай фантастыкі... » [1, с. 9]. Працытаванае указвае на жанравы еінкрэтызм вереэта.

Разанаўскі вереэт успрымаецца як страла, пушчаная нацянькі да пэўнай мэты. Гэта мэта – розум, «вольны ад асабовасці» [2, с. 8]. «Страла і мэта» – назва знакавага артыкула У. Калесніка пра творчасць А. Разанава.

Паэт укладае ў тэрмін «медытатыўная лірыка» іншы сэнс, чым агульнапрызнаны ў літаратуразнаўстве (вершы філасофскага зместу). З пункту гледжання зместу нельга адмаўляць сувязі версэтаў з медытатыўнасцю. У гэтым сэнсе паказальным з’яўляцца твор «Вобразы вабяць услед за сабой» (1987), які закрывае вереэтавую нізку зборніка «Вастрые стралы» (1988). Адначасова ў творы прысутнічае рытм. Яго стварэнню спрыяюць сінтаксічныя паралелізмы, градацыя і інверсія.

Тым не менш крытыкай зазначалася, што вереэты Разанава не пазбаўленыя пачуццёвасці. Адным са сродкаў руху ад канстатавальнага да пачуццёвага бачыцца ўпляценне ў паэтычную тканіну тэксту слоў з неўласцівым ім значэннем.

Такім чынам, вереэт займае важнае месца ў сённяшнім паэтычным полі паэта. Разанаўскія вереэты – гэта еінкрэтычны экспсрыментальна-аўтарскі жанр, які спалучыў у сабе верш у прозе (верез) з элементамі верлібра, істотна размыўшы ці пашырыўшы межы паміж паэзіяй і прозай.

**Літаратура**

1. **Разанаў, А.С.** Паэзія / А. С. Разанаў // ЛіМ. – 26 жніўня 1983 г. – С. 9.
2. **Разанаў, А. С.** Вастрые стралы / А. С. Разанаў. – Мінск : Мастацкая літаратура, 1988. – 160 с.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова